Цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага
Аддзел інфармацыйна-бібліяграфічнай работы



# Міхась Лынькоў

# Спакойная мудрасць, мужны талент

Да 120-годдзя з дня нараджэння

Бібліяграфічны нарыс

Віцебск, 2019

*Вы знаеце словам цану. Вы зведалі шмат на зямлі.*
*Вучылі дзяцей, салдатам былі, дыпламатам,*
*Вучоным былі, рыбаком нарачанскім слылі…*
*Анатоль Вярцінскі*

Народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў, у першую чаргу, нам вядомы як празаік, дзіцячы пісьменнік, крытык, літаратуразнавец, а яшчэ ён быў грамадска-палітычным дзеячам, навукоўцам і, што вельмі важна, сціплым, сумленным чалавекам. Выключная сціпласць і сумленнасць, прынцыповасць у кожнай справе, заклапочанасць аб развіцці роднай мовы і літаратуры, дабрата і любоў да людзей – усё гэта было характэрным для пісьменніка.

Нарадзіўся **Міхаіл Ціханавіч Лынькоў** 30 лістапада 1899 года ў вёсцы Зазыбы Віцебскага павета Віцебскай губерні ў сям'і чыгуначнікаў, якія паходзілі з бедных сялян. Бацька будучага народнага пісьменніка Беларусі працаваў рамонтным рабочым, а маці – вартаўніцай на пераездзе. Дзіцячыя гады пісьменніка прайшлі ў казарме на перагоне паміж станцыямі Магілёў і Лотва і ў чыгуначнай будцы паміж станцыямі Тошчыцы і Рагачоў. Сям'і прыходзілася часта мяняць месца жыхарства, пакуль бацька не знайшоў працу пуцявога абходчыка ў Старым Сяле, непадалёку ад Рагачова. Скончыўшы вясковую школу, Міхась паступіў у Рагачоўскую школу пры настаўніцкай семінарыі, а пасля яе заканчэння — і ў саму семінарыю, якую скончыў у 1917 годзе. Вучыўся ён старанна, але грошай на жыццё не хапала, таму Міхась падзарабляў на чыгунцы і яшчэ даваў прыватныя ўрокі.

Пасля працаваў настаўнікам у Ліпінецкай земскай школе Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Як чалавек адукаваны і прыхільны да новых палітычных павеваў прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх важнейшых падзеях мясцовага грамадскага жыцця. У час нямецкай акупацыі меў непасрэднае дачыненне да арганізацыі партызанскага атрада.

Сваю пісьменніцкую дзейнасць Міхась Лынькоў пачаў з вершаў і падпісваўся пад псеўданімам Васілёк. Усе яго браты таксама пісалі вершы. У 1919 годзе ў смаленскай газеце *«Борьба»* Міхась Лынькоў апублікаваў свой першы верш, а першае апавяданне - у 1926 годзе ў бабруйскай газеце *«Камуніст»* і зборніку бабруйскай філіі *«Маладняка»* - *«Уздым»*. У 1919 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію на службу, у час якой М. Лынькоў прыняў удзел у савецка-польскай вайне (1919–1920г.), вызваляючы Беларусь. Назіранні падзей таго часу сталі змястоўнай асновай некаторых яго пазнейшых твораў.

Дэмабілізаваўся Міхась Лынькоў у 1922 годзе, які стаў для яго вельмі цяжкім: памёр бацька, трагічна загінула маці, на руках у Міхася засталіся малодшыя брат і сястра, аб якіх трэба было клапаціцца.

Пэўны час Міхаіл Ціханавіч працаваў настаўнікам у мястэчку Свержань Рагачоўскага раёна. У гэты ж перыяд ён быў актыўным селькорам, дасылаў свае допісы ў бабруйскую акруговую газету *«Камуніст»*, у якую ў хуткім часе быў запрошаны на пастаянную працу. У Бабруйск пераехаў разам з братамі і сястрой. Працуючы ў акруговай газеце, Міхаіл Ціханавіч прайшоў усе ступені прафесійнага журналісцкага ўзвышэння: ад сакратара рэдакцыі да адказнага рэдактара. Ён рабіў вялікія намаганні, каб аб'яднаць вакол газеты таленавітую літаратурную моладзь Бабруйшчыны. Вынікам гэтых намаганняў стала стварэнне бабруйскай філіі *«Маладняка»*, якая стала выдаваць літаратурны альманах *«Уздым»* і штомесячны літаратурны дадатак да газеты *«Вясна»*.

З гэтага часу пачалася яшчэ больш мэтанакіраваная творчая пісьменніцкая праца Міхася Лынькова. *«Праца мая,* — згадваў ён, — *у якасці рэдактара газеты, удзел у грамадскім жыцці, частыя наведванні фабрык, заводаў, вёсак пашыралі мой кругагляд, давалі мне багаты запас назіранняў. Усё гэта дапамагала маёй пісьменніцкай дзейнасці»*.

Лынькоў спрабаваў пісаць п’есы, але найбольш поўна ў маладыя гады ён раскрыўся як навэліст. Творы, якія напісаў Лынькоў у гэты час, прысвечаны ў асноўным Грамадзянскай вайне і побыту беларускіх вёсак і мястэчак. Пісьменнік імкнуўся завастрыць увагу на тых працэсах, якія адбываліся ў грамадстве пасля рэвалюцыі, як змяняліся самі людзі. Да гэтага перыяду адносяцца творы: ***«Андрэй Лятун», «Чыгунныя песні», «Над Бугам», «Гой», «Манчжур», «Кларнет», «Беня-балагол»*** і іншыя.

У 1927 годзе Міхась Лынькоў ажаніўся з Ханай Арэнкавай, і ў хуткім часе ў іх нарадзіўся сын Марэк. У 1930 годзе пісьменнік пераехаў у Мінск, дзе ўладкаваўся на працу ў Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Добра ведаючы пра цяжкае жыццё ў новаствораных калгасах, Лынькоў напісаў у 1932 годзе аповесць ***«Саўка-агіцірнік»***: гісторыю з асабістага вопыту пра тое, як добрасумленнага чалавека выключылі з калгаса толькі за тое, што ён казаў праўду. Баючыся рэпрэсій за праўду, Міхась Лынькоў нават зрабіў пазнаку ў творы — «Крупскі раён», паказваючы тое месца, дзе гэта адбылося.

У 1933 годзе ён стаў рэдактарам літаратурнага часопіса *«Полымя рэвалюцыі».* У 1934 годзе выйшлі зборнік ***“На вялікай хвалі”*** і раман ***“На чырвоных лядах”***, асноўны змест якога складае рэалістычны паказ старой беларускай вёскі.

Праз год Міхаіла Ціханавіча прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР. У гэты ж час М. Лынькоў пачаў пісаць творы для дзяцей і падлеткаў. У 1935 годзе выйшла ў свет аповесць ***«Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў»***, дзе ў прыгодніцкім стылі расказваецца пра савецка-польскую вайну. У 1936 годзе свет убачыла аповесць ***«Міколка-паравоз»***, у якой аўтар апісаў не толькі падзеі і дзеючых асоб, але і паравозы, якія любіў з дзяцінства: *«Адзін так гудзіць, што шыбы трасуцца ў вокнах. У другога хрыпаты голас, нібы прастудзіўся паравоз, бегаючы ў зольных*

*туманах і завеях. А трэці… не гудзіць, а пасвіствае галаском такім тонкім, пранізлівым»*. Аповесць экранізавана ў 1957 годзе. Пазней выйшлі яшчэ дзіцячыя творы пісьменніка: ***«Янка-парашутыст»*** (1937), ***«Ядвісін дуб»*** (1940), ***«Апавяданні»***. Творы Лынькова чыталі і дарослыя, і дзеці.

У 1938 годзе Міхася Лынькова абралі на пасаду старшыні Саюза пісьменнікаў БССР. Існуе нямала сведчанняў, што менавіта Лынькоў абараніў многія творы беларускай літаратуры, як і іх аўтараў, ад сталінскіх рэпрэсій.

Летам 1941 года пісьменнік быў прызначаны рэдактарам франтавой газеты *«За Савецкую Беларусь»*, якая выходзіла на Заходнім, Цэнтральным і Бранскім франтах.

У верасні 1941 года расстралялі жонку Міхаіла Ціханавіча Хану з сынам, якія не змаглі эвакуіравацца і трапілі да немцаў. Пісьменнік даведаўся пра гэта пазней. У тым жа годзе знік без вестак на фронце малодшы брат Рыгор. Смерць брата, жонкі і сына для Лынькова была страшэнным ударам, ад якога ён доўгі час не мог аправіцца.

У 1943 годзе М. Лынькова прызначылі дырэктарам Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва Акадэміі навук БССР.

Самым вялікім творам Міхася Лынькова стаў раман-эпапея ***«Векапомныя дні»*** (1951-1958) ў чатырох кнігах, у якім аўтар паспрабаваў апісаць лёс народа, яго гераізм і мужнасць, побыт простых людзей і дзеянні партызан ў час Вялікай Айчыннай вайны. У рамане шырока выкарыстаны дакументальны матэрыял, многія героі мелі канкрэтных прататыпаў. *"Заслуга Міхася Лынькова ў тым,* — пісаў Іван Шамякін, — *што ён першы паказаў партызанскі рух у яго ўсеабдымнасці… Перачытаўшы "Векапомныя дні", я захапляўся грандыёзнасцю працы, якую зрабіў Лынькоў"*. У гэтым творы выявіліся лепшыя ўласцівасці душы Лынькова, які заўсёды прываблівыў людзей чалавечнасцю, мудрасцю, самабытнасцю і мужнасцю сваёй душы. За раман ***«Векапомныя дні»*** Міхаіл Ціханавіч стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968).

Пасля вайны ён актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, займаўся расследаваннем нацысцкіх злачынстваў у Мінску, удзельнічаў у пасяджэннях ААН у ЗША. У 1962 годзе Міхаілу Ціханавічу было прысвоена высокае званне — **народны пісьменнік Беларусі.**

Міхасю Лынькову належаць і літаратуразнаўчыя працы: ***«Беларуская літаратура за 30 год»*** (1948, на беларускай і рускай мовах), ***«Якуб Колас»*** (1952), ***«Летапіс эпохі: Беларускай савецкай літаратуры пяцьдзясят год»*** (1968); зборнікі ***«Літаратура і жыццё»*** (1978), ***«Публіцыстыка»*** (1980); крытычныя артыкулы пра творчасць Я. Брыля, Я. Коласа, Я. Купалы, К. Крапівы, І. Мележа, К. Чорнага і інш. Выйшлі зборы твораў пісьменніка ў чатырох (1967—1968) і васьмі (1981—1985) тамах.

Міхась Лынькоў пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Гідаша, М. Горкага, М. Ціханава і інш. Яго кнігі таксама перакладзены на некалькі моў, а літаратурная спадчына і сёння не страціла сваёй папулярнасці. За сваю творчую і грамадскую дзейнасць Міхаіл Ціханавіч Лынькоў узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Яшчэ пісьменнік захапляўся фатаграфіяй, любіў важдацца з тэхнікай і лавіць рыбу, жыў па законах сумлення. Перад смерцю завяшчаў аднаму з дзіцячых дамоў вялікую суму грошай.

Памёр Міхаіл Ціханавіч Лынькоў 21 верасня 1975 года і пахаваны на Усходніх могілках Мінска.

У 2011 годзе Бабруйскім гарадскім выканаўчым камітэтам заснавана прэмія імя Міхася Лынькова, якая прысуджаецца дзеячам культуры, мастацтва, адукацыі, прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі горада, якія сваёй штодзённай працай і асабістым прыкладам уносяць значны ўклад у папулярызацыю беларускай мовы.

Імем Міхася Лынькова названы вуліцы ў Мінску, Бабруйску, Пінску, у пасёлку Лужасна Віцебскага раёна, яго імя носіць Крынкаўская сярэдняя школа Лёзненскага раёна, дзіцячая бібліятэка ў Віцебску. У гонар народнага пісьменніка ўсталяваны мемарыяльныя дошкі ў Мінску на доме № 12 на праспекце Незалежнасці, дзе ён жыў, і на доме № 1 па вуліцы Міхася Лынькова, а таксама ў Бабруйску на будынку, дзе месцілася рэдакцыя газеты *«Камуніст».*

*Рэкамендацыйны бібліяграфічны нарыс і спіс літаратуры* ***“Спакойная мудрасць, мужны талент”*** *прысвечаны* ***120-годдзю з дня нараджэння Міхася Лынькова*** *і адрасаваны бібліятэкарам, настаўнікам, вучням, усім тым, хто цікавіцца жыццём і творчасцю пісьменніка. Бібліяграфічны спіс уключае кнігі і артыкулы з фонду Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага г.Віцебска.*

## Творы М. Лынькова

**Збор твораў:** у 8 т. / Міхась Лынькоў; [рэдкал.: В.В. Барысенка [і інш.]; уступ. артыкул Ю. С. Пшыркова]. - Мн.: Навука і тэхніка,1981-1985.

**Збор твораў**: у 4 т. / Міхась Лынькоў. – Мн.: Беларусь,1967-1968.

**Апавяданні:** [для сярэд. школ. узросту] / Міхась Лынькоў; прадм. Дз. Бугаёва – Мн.: Нар. асвета,1979. – 176 с. – (Школ. б-ка).

**Векапомныя дні:** раман у 4 т. / Міхась Лынькоў. – Мн.: Маст. літ.,1958.

**Літаратура і жыццё:** літ.-крыт. артыкулы / Міхась Лынькоў. – Мн.: Маст літ.,1978. – 512 с.

**Міколка-паравоз**: аповесць / Міхась Лынькоў. – Мн.: Маст літ.,2018. – 125 с.

**Над Бугам:** апавяданні, аповесці, урыўкі з рамана [“На чырвоных лядах”] / Міхась Лынькоў. – Мн.: Маст. літ.,2002. – 446 с. – (Беларус. проза XX ст.).

**Насустрач жыццю**: апавяданні: для сярэд. і ст. шк. узросту / Міхась Лынькоў; прадм. Д. Бугаёва; маст. Ю. Цярэшчанка. – Мн.: Юнацтва, 1988. – 256 с.: іл. – (Школ. б-ка).

**Незабываемые дни:** роман: в 2 кн. / Михась Лыньков; авториз. пер. с белорус. Е. Мозолькова; [худож. М. М. Петренко]. – М.: Сов. писатель,1979.

**Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў**: аповесць і апавяданні / Міхась Лынькоў; маст. В. П. Ісачанка. – Мн.: Юнацтва,1997. – 174 с.: іл.

**Сустрэчы**: апавяданні, аповесць / Міхась Лынькоў; уклад., прадм. і камент. М. Кенькі. – Мн.: Маст. літ.,1996. – 302 с.: іл.

**Творы:** [апавяданні, аповесці, раман] / Міхась Лынькоў; уклад. і камент. М. П. Кенькі; навук. рэд. М. І. Мушынскі. – Мн.: Маст. літ.,2017. – 678 с. – (Залатая калекцыя беларус. літ.; Т. 14).

## Літаратура аб жыцці і творчасці М. Лынькова

**Бугаёў, Дз.** Шчодрае сэрца пісьменніка: проза Міхася Лынькова даваеннага часу / Дзмітрый Бугаёў. – Мн.: Дзяржвыд. БССР,1963. – 200 с.

**Кенька, М. П.** Міхась Лынькоў: летапіс жыцця і творчасці / М. П. Кенька. – Мн.: Універсітэцкае,1987. – 176 с.

**Куляшоў, Ф.** Міхась Лынькоў: нарыс жыцця і творчасці: для сярэд. і ст. школ. узросту / Фёдар Куляшоў. – Мн.: Нар. асвета,1979. – 191 с.: іл.

**Святло яго душы:** успаміны пра Міхася Лынькова / [склад. С. Лынькова-Куспіц і Ю. Пшыркоў; камент. і рэд. Ю. Пшыркова]. – Мн.: Маст. літ.,1979. – 368 с.: іл.

**Лыньков Михась (Михаил Тихонович)** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Мн.,2007. – Т. 4. – С. 575.

**Лынькоў Міхась** // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мн.,1994. – Т. 4. – С. 117-130.

**Лынькоў Міхась (Міхаіл Ціханавіч)** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мн.,1999. – Т. 9. – С. 383.

**Лынькоў Міхась (Міхаіл Ціханавіч)** // Культура Беларусі : энцыклапедыя. – Мн.,2014. – Т. 5. – С. 171.

**Лынькоў Міхась Ціханавіч** // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мн.,1994. – С. 322-324.

**Лынькоў Міхась (Міхаіл Ціханавіч)** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мн.,1997. – Т. 4. – С. 407.

**Міхась Лынькоў** // Беларускія пісьменнікі (1917-1990) : даведнік / [склад. А.К. Гардзіцкі]. – Мн.,1994. – С. 348-349.

**Бугаёў, Дз.** Міхась Лынькоў / Дзмітрый Бугаёў // Спавядальнае слова / Дзмітрый Бугаёў. – Мн.,2001. – С. 158-183.

**Бугаёў, Дз.** Сэрца ў яго сапраўды было шчодрае: (М. Лынькоў: пісьменнік і час) / Дзмітрый Бугаёў // Служэнне Беларусі / Дзмітрый Бугаёў. – Мн.,2003. – С. 124-168; Полымя. – 1999. - № 11. – С. 184-204.

**Дасаева, Т. М.** [Пра апавяданне М. Лынькова ***“Андрэй Лятун”***] / Т. М. Дасаева // Пошукі героя: з вопыту беларускай прозы 20-х гадоў / Т. М. Дасаева. – Мн.,1993. – С. 98-100.

**Дасаева, Т. М.** [Пра апавяданне М. Лынькова ***“Над Бугам”***] / Т. М. Дасаева // Пошукі героя: з вопыту беларускай прозы 20-х гадоў / Т. М. Дасаева. – Мн.,1993. – С. 38-40.

**Куляшоў, Ф. І.** Шлях да майстэрства: нарыс аб творчасці Міхася Лынькова / Ф. І. Куляшоў // Літаратурныя партрэты: літаратур.-крытыч. нарысы / Ф. І. Куляшоў. – Мн.,1983. – С. 3-200.

**Куляшоў,Ф.** Дарогамі жыцця / Фёдар Куляшоў // Пра таварышаў па пяру: зб. крыт. арт. – Мн.,1976. – С. 73-80.

**Кучар, А.** Апавяданні Міхася Лынькова / Алесь Кучар **//** Літаратурна-крытычныя артыкулы / Алесь Кучар. – Мн.,1980. – С. 65-90; Аблічча часу / Алесь Кучар. – Мн.,1971. – С. 209-241; Аб мастацкай прозе / Алесь Кучар. – Мн.,1961. – С. 101-141.

**Міхась Лынькоў** (1899-1975) // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: 1917-1940 / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мн.,1981. – С. 420-453.

**Хведаровіч, М.** Водбліскі зыркіх вогнішчаў / Мікола Хведаровіч // Незабыўнае / Мікола Хведаровіч. – Мн.,1976. – С. 4-19.

**Жураўлёў, В.** Мастацкая функцыя побыту ў рамане Міхася Лынькова **“На чырвоных лядах”** / Васіль Жураўлёў // Род. слова. – 2001. - № 5. – С. 32-35.

**Канапелька,С.** М. Лынькоў нарадзіўся ў Віцебскім раёне / С. Канапелька // Віцеб. рабочы. – 1999. – 27 лістап. – С. 2.

**Капуста, Ж.** “Незабываемые дни” Михася Лынькова: творческие радости и грех книгокрадства / Жанна Капуста // ЛіМ. – 2018. – 22 чэрв. (№ 24). – (Прил.: Лира. - № 2. – С. 2).

**Локун, В.** “Векапомныя дні” – пра вогненныя гады: [раман М. Лынькова ***“Векапомныя дні”***] / Валянцін Локун // Беларус. думка. – 2005. - № 7. – С. 152-156.

**Марціновіч, А. “**Гэтыя месцы мне да болю знаёмы” / Алесь Марціновіч // Полымя. – 2016. - № 8. – С. 175-177.

*Дзяцінства М. Лынькова прайшло на Рагачоўскай зямлі.*

**Нікіценка, С.** Спроба перачытання / Сяргей Нікіценка // ЛіМ. – 2009. – 4 снеж. (№ 46). – С. 1.

**Рагуля, А.** Семантычныя ёмкасці лакальнай формы: эстэтыка прозы Міхася Лынькова / Аляксей Рагуля // Род. слова. – 2009. - № 11. – С. 3-6.

**Саламаха, Ул.** Да Лынькова ў Крынкі / Ул. Саламаха // Маладосць. – 2000. - № 2. – С. 237-245.

**Салтук, А.** Грамадзянін, пісьменнік, вучоны / А. Салтук // Віцеб. рабочы. – 1999. – 30 лістап. – С. 3.

**Салтук,А.** Разам з народам / А. Салтук // Віцеб. рабочы. – 2004. – 30 лістап. – С. 4.

**Тычына, М.** Пясняр рамантычнага парыву: штрыхі да партрэта Міхася Лынькова / Міхась Тычына // Род. слова. – 1999. - № 11. – С. 11-26.

## Вывучэнне творчасці М. Лынькова ў школе

**Семяноўская,Л. В.** Міхась Лынькоў у школе / Л. В. Семяноўская. – Мн.: Дзярж. вучэб.-пед. выд. М-ва асветы БССР,1963. – 104 с.

**Буланда, В.** Вогнепаклоннік з добрым сэрцам: літаратур. вечарына / Вера Буланда // Род. слова. – 2009. - № 11. – С. 70-74.

**Васілёнак, С. В.** Дзеці на вайне ў апавяданні М. Лынькова **"Васількі"**: (урок у V кл.) / С. В. Васілёнак // Беларус. мова і літ. – 2014. - № 1. – С. 37-38.

**Дамброўская,С. В.** Вывучэнне апавядання М. Лынькова **"Васількі"**: (V кл.) / С. В. Дамброўская // Беларус. мова і літ. – 2014. - № 1. – С. 39-41.

**Жуковіч, М.** Сцежкамі маленства: вывучэнне аповесці Міхася Лынькова **"Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў"** / Мікола Жуковіч // Род. слова. – 1996. - № 3. – С. 100-104.

**Солахаў, А.** Міхась Лынькоў: жыццё і дзейнасць: [літаратур. віктарына] / Аляксей Солахаў // Род. слова. – 1999. - № 11. – С. 160-165.

**Сударыкава, Н. В.** Жыццёвыя пуцявіны Міхася Лынькова: літаратур. гасцёўня для вучняў VI–X кл. / Н. В. Сударыкава // Беларус. мова і літ. – 2013. - № 11. – 54-60.

**Яфімава, М. Б.** Прамяністае святло таленту: [сцэнарый літаратур. вечарыны] / М. Б. Яфімава // Зямля бацькоў, зямля святая / М. Б. Яфімава. – Мн.,1997. – С. 75-84.

*© 2019. ЦГБ імя М.Горкага*

*Аддзел інфармацыйна- бібліяграфічнай работы*
*Складальнік: Ж. Кабылкіна*
*Афармленне: Н. Савіцкая*
*Рэдактар: В. Букіна*